ББК 63.3(2 Б)

Н.М.Якуш, дацэнт

# БЕЛАРУСКАЯ НАЦЫЯНАЛЬНАЯ ІДЭЯ: СТАН СУЧАСНАГА НАВУКОВАГА АСЭНСАВАННЯ З ПАЗІЦЫЙ ГІСТАРЫЧНАГА ВОПЫТУ

Адным з вядучых кіраўнікоў дзяржаўна-прававога будаўніцтва ў Рэспубліцы Беларусь з'яўляецца вырашэнне праблемы культурна-моўнага развіцця. Гэта выклікае вялікую цікавасць да паняцця беларускасці і стымулюе пошукі навуковых метадаў раскрыцця культурна- і палітычна-гістарычных тыпаў беларуса, выяўлення яго этнічнай і нацыянальнай ментальнасці (лад быцця і думак, светаўспрыманне і склад душы).

Змест і формы першапачатковай этнічнай свядомасці беларусаў узнікаюць з утварэннем беларускай мовы і традыцыйнай (непрафісійнай) культуры. Іх асноўныя элементы як перадумовы фарміравання беларускага народа склаліся ў краі да сярэдзіны XII ст. Перыяд XI-XII стст. быў часам дзяржаўнага ўздыму Полацкага і Тура-Пінскага княстваў, развіцця дойлідства, песьменнасці, прыкладнога і выяўленчага мастацтваў, асветніцкай дзейнасці Е.Полацкай і К.Тураўскага.

Тэрыторыя сучаснай Беларусі ў азначаны перыяд ўяўляла сабою дзве культурна-лінгвістычныя зоны - Папрыпяцце і Падзвінне з сумежным Верхнім Падняпроўем. Моўнае і культурнае адзінства насельніцтва кожнай з зон увасаблялася ў форме устойлівых назваў: Палессе-"палешукі", Белая Русь-"беларусцы". Гэтыя саманазвы выдзялялі насельнікаў рэгіёна з астатніх груп усходнеславянскага насельніцтва і з больш шырокай назвы"русіны", якой абазначаліся ўсе ўсходнія славяне.

У XII-XIY стст. землі сучаснай Беларусі увайшлі ў склад новай дзяржавы, скарочаная назва якой у гісторыі - Вялікае княства Літоўскае. Палітычна-прававая цэнтралізацыя і ліквідацыя раздробленасці феадальных уладанняў паскарылі працэсы кансалідацыі і культурнага сінтэзу грамадства. Пры гэтым да славяна-візантыйскай традыцыі далучаліся новыя для гэтага рэгіёну еўрапейскія творчыя імпульсы, ствараўся самабытны ўсходнеславянскі тып сярэдневяковай культуры ў формах асобай правасвядомасці, дзяржаўнасці, фальклору, народных абрадаў, архітэктуры і прыкладнога мастацтва.

Новая моўная сістэма ў арэале ўсходнеславянскага насельніцтва, якую сёння мы называем беларускай, з'явілася ў XII-XIУ стст. у выніку змяшання гаворак палешукоў і старажытных беларусаў. Утварэнне мовы беларускага народа адбывалася спачатку ў цэнтральнай частцы сучаснай Беларусі. З нагоды назвы Панямонскага краю і кароткай назвы новай дзяржавы ("Літва"), мясцовае насельніцтва, што стала размаўляць на новай мове, атрымала назву "ліцвіны". Палітычнае значэнне гэтага тэрміну ў рэгіёне дапоўнілася этнічным. У наступныя стагоддзі этнонім "ліцвін" стаў прымяняцца для вылучэння мясцовага насельніцтва з астатняга ўсходнеславянскага. Адначасова ўжываўся этнонім "русіны", "рускі" для адрознення ад літоўцаў. Акрамя гэтых двух, ужывалася і назва "беларусцы" (беларусы), якая у перыяд фарміравання абазначала найперш насельнікаў Падзвіння. Толькі ў новых палітычных умовах, з канца ХУШ ст. назва беларусы зафіксавалася як асноўная форма яго этнічнай самасвядомасці.

Важнейшым перыядам ў ходзе пераўтварэння культуры беларускай народнасці ва ўласна беларускую нацыянальную культуру і змене этнічнай самасвядомасці нацыянальнай стала ХУІ ст. Менавіта тады духоўная плынь Рэнесансавага гуманістычнага адраджэння закранула беларускія землі, а Ф.Скарына надаў ёй спецыфічна славяна-беларускі кірунак, паколькі спалучыў у сваёй дзейнасці айчынныя традыцыі і вопыт заходнееўрапейскіх гуманістычных культурных здабыткаў.

Але ўслед за эпохай гуманістычнага адраджэння беларускія землі перажылі амаль двухсотгадовы перыяд вельмі бурлівага, але запаволенага, часам "паўпадпольнага", неафіцыйнага развіцця беларускай культуры, літаратуры і літаратурнай мовы. Тыповымі дзеячамі культуры Беларусі гэтага перыяду былі пісьменнікі, што стаялі на скрыжаванні славянскіх традыцый. Ужо Сымон Будны і Сімяон Полацкі стаялі на сумежжы дзвюх культур: першы - беларускай і польскай, другі - беларускай і расейскай.

Выключаная з афіцыйнага функцыянавання, этнаграфічная культура ізалявалася і засяродзілася між працоўнага люду. Сацыяльныя вярхі беларускага грамадства папалі пад "пераплаўку", паколькі беларускія землі трапілі на мяжу процістаяння двух славянскіх цэнтраў - польскай кароны і Маскоўскага царства. Адсюль нізкія тэмпы і незавершанасць развіцця беларускага этнасу. Тым не менш у 20-60-х

гадах XIX ст. у рамках польскага нацыянальна-вызваленчага руху нараджаецца беларускае літаратурнае асветніцтва, прадстаўленае творчасцю Я.Баршчэўскага, П.Багрыма, Я.Чачота, А.Вярыгі-Дарэўскага, У.Сыракомлі, В.Дуніна-Марцынкевіча і г.д. Гэты этнаграфічна-культурны рух набыў пэўную палітычную афарбоўку ў паўстанні 1863-64 гг., і толькі на схіле XIX ст. народніцкая група "Гоман" ідэйна і палітычна абгрунтавала ў якасці альтэрнатывы імперскаму абсалютызму ідэю "федэратыўнай самастойнасці Беларусі" на падставе пагаднення з іншымі народамі дэмакратызаванай Расіі. Найбольш поўна беларуская ідэя аформілася падчас рэвалюцыі 1905, 1917 гг. Але трэба зазначыць, што гэта датычылася найбольш палітызаванай, але нязначнай часткі грамадства. Прыходзіцца канстатаваць факт, што канец XIX - пачатак XX ст. далі шэраг імпульсаў кансалідацыі беларусаў у нацыю, але не далі самой нацыі.

Урэшце разам з многімі недааформленымі нацыямі беларусы ўвайшлі ў склад Савецкага Саюза. Сацыяльна-эканамічнае і палітычнае развіццё ў складзе СССР унесла многа якасна новых змен у светапогляд беларусаў. Гэтую рэальнасць трэба улічваць пры абгрунтаванні нацыянальнай ідэі, паколькі нацыя - гэта не толькі этнас, а сацыяльна-гістарычнае ўтварэнне. У нашым разуменні яна выступае як этнасацыяльны арганізм (нацыя ў еўрапейскім сэнсе - дзяржаўна аформлены этнас).

Шукаючы самаідэнтыфікацыю беларусаў, сучасныя вучоныя адзначаюць неакрэсленасць, размытасць самасвядомасці беларусаў, шматаблічнасць іх менталітэту. Але ў адным даследчыкі зыходзяцца амаль аднадушна: беларуская ментальнасць - гэта адмаўленне крайніх, "месіянскіх" форм усходняга "візантызму".

ББК 63. 3(2 Б)

В.С.Лявоненка, асістэнт

## ФАРМІРАВАННЕ ТЭРЫТАРЫЯЛЬНА-ПРАМЫСЛОВАГА КОМПЛЕКСУ БЕЛАРУСІ У 70-я ГАДЫ XX ст.

На пачатак дзевятай пяцігодкі Беларусь, як і ўся краіна, перанесэнсоўвала першыя вынікі эканамічнай рэформы 1965 года. Рэформа, нягледзячы на яе абмежаванасць і непаслядоўнасць, дала пэўны эканамічны і сацыяльны эфект. Адбылося паляпшэнне работы прамысловасці і наогул ўсей гаспадарчай дзейнасці. Асноўнымі